**Латыши и белорусы: вместе сквозь века.** – 2019. – Вып. 8. – С. 12–17.

***ИСТОРИЯ***

# РАЗВІЦЦЁ АСВЕТЫ І АДУКАЦЫІ Ў ЛАТЫШСКІХ ПАВЕТАХ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ДАСАВЕЦКІ ПЕРЫЯД

## The development of education in the Latvian counties of Viciebsk region on the pre-soviet period

**Ул. Тугай, Т. Папоўская (U. Tuhai, T. Papouskaya),**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
*г. Мінск, Беларусь*

В статье рассматривается история становления и развития системы народного образования и просвещения в Витебской губернии в досоветский период. Особое внимание уделено исследованию данных процессов, происходивших на территории Витебской Латгалии.

*Ключевые слова*: Витебская губерния, Латгалия, народное образование, просвещение, латышское меньшинство.

The article deals with the history of formation and development of the system of public education in Viciebsk region in the pre-Soviet period. Special attention to the study of these processes that took place on the territory of Viciebsk Latgale is paid.

*Keywords*: Viciebsk region, Latgale, national education, education, Latvian minority.

Адным з галоўных паказчыкаў культурнага развіцця Латгаліі ў дарэвалюцыйны перыяд з'яўляліся народная асвета і адукацыя. Гісторыя вучэбных устаноў на Віцебшчыне цесна звязана з гісторыяй царквы. Да пачатку ХХ ст. навучанне і адукацыя ў краі канцэнтраваліся выключна ў руках духавенства. Адкрыццё тут першых адукацыйных устаноў, аб якіх маюцца звесткі, было звязана з кальвіністамі. У другой палове XVI ст. у Полацку з'явіліся езуіты, выкліканыя сюды польскім каралём Стэфанам Баторыям, які надзяліў іх багатымі маёнткамі і даручыў «исправлять нравы жителей учением и примером» [1, с. 289].

Зацвердзіўшыся ў Полацку ў канцы XVI ст., езуіты заснавалі тут вучылішча і калегіум, а ў першай палове XVII ст. перабраліся ў Дынабург і Віцебск, дзе таксама адкрылі калегіумы. Усе езуіцкія калегіумы ў Латгаліі былі арганізаваны на адзін лад: пры кожным з іх існавала гімназія з 5-ці класаў, якія называліся: інфіма, граматыка, сінтаксіс, паэтыка і рыторыка. Галоўнымі прадметамі выкладання ў

першых трох класах былі лацінская і грэчаская мовы; два вышэйшыя класы называліся гуманіора. Гэта была школа свецкая. Асобная духоўная школа прызначалася для тых, хто жадаў паступаць у ордэн езуітаў. Апошняя мела сямігадовы курс: трохгадовы філасофіі і чатырохгадовы багаслоў'я. Акрамя вышэйадзначаных езуіцкіх школ, існавалі яшчэ школы манаскіх ордэнаў піяраў і базыльян.

У 1773 г. булаю папы Клімента XIV езуіцкі ордэн быў закрыты. Езуіты шукалі абароны і заступніцтва ў імператрыцы Кацярыны II, якая даравала ім прытулак у Расіі і дазволіла займацца выхаваннем юнацтва. Такім чынам езуіцкі ордэн замацаваўся ў межах Беларусі і працягваў працаваць тут на ніве адукацыі. У 1812 г. па іх просьбе Полацкі калегіум быў ператвораны ў акадэмію з правам, якое прадстаўлялася універсітэтам. Напрыклад, Полацкая акадэмія выпісвала з-за мяжы розныя кнігі і інструменты без усялякіх пошлін і мытнай рэвізіі, таму валодала надзвычай цэннай бібліятэкай. Полацкая акадэмія існавала толькі 8 гадоў. У дакладзе міністра духоўных спраў і народнай адукацыі князя Галіцына езуіты абвінавачваліся ў тым, што яны зводзілі даверанае ім юнацтва ў рымска-каталіцкую веру. 13 сакавіка 1820 г імператар Аляксандр I загадаў: «иезуитов, как забывших священный долг не только благодарности, но и подданнической присяги и потому недостойных пользоваться покровительством российских законов, выслать под присмотром полиции за пределы государства и впредь ни под каким видом и наименованием не впускать в Россию; Полоцкую академию и подведомственные ей учреждения упразднить» [2, с. 334]. Са свецкіх вучылішч у Віцебскай губерні вядомы былі толькі два: Полацкае галоўнае народнае вучылішча і Віцебскае, ператворанае ў 1794 г. у губернскую гімназію.

Усе вучылішчы, якія знаходзіліся ў паветах, дзе пражывалі латышы, былі прызначаны для вышэйшага і сярэдняга класаў насельніцтва. Што тычыцца простага народа, то аб яго адукацыі клапаціліся мала. Спецыяльных народных школ не было, а існуючыя па прычыне шырокай праграмы не маглі задаволіць патрэб шырокіх народных мас. Усеагульныя школы пачалі адкрывацца галоўным чынам пасля 1831 г. па гарадах і толькі з 1862/63 гг. па мястэчках і вёсках. Да 1889 г. ва ўсіх гарадах Віцебскай губерні налічвалася 75 навучальных устаноў, з якіх 45 – мужчынскіх і 30 – жаночых [3, с. 65].

Па гарадах, дзе пражывала латышскае насельніцтва, яны размяркоўваліся ў наступным парадку:

а) мужчынскія: Дынабург – рэальнае вучылішча, гарадское прыхадское вучылішча, прыватнае трохкласнае вучылішча, пачатковае

вучылішча для дзяцей рамеснікаў, вучылішча пры евангелісцка-лютэранскай царкве, пачатковае аднакласнае яўрэйскае вучылішча з падрыхтоўчым класам, трохкласнае яўрэйскае рамеснае вучылішча; Себеж – павятовае вучылішча, гарадское прыходскае вучылішча, прыватная школа рускай граматы для яўрэяў; Рэжыца – гарадское двухкласнае вучылішча па палажэнні 31 мая 1872 г., гарадское прыходскае вучылішча, прыватная школа рускай граматнасці для яўрэяў;

б) жаночыя: Дынабург − жаночая сямікласная гімназія ведамства Міністэрства народнай асветы, жаночая змена пры гарадскім прыходскім вучылішчы, прыватнае жаночае трохкласнае вучылішча, прыватнае жаночае аднакласнае вучылішча, прыватная пачатковая школа для дзяцей абодвух палоў, прыватнае двухкласнае жаночае яўрэйскае вучылішча і г.д. [1, с. 349−352].

У 1830 г. у Дынабургу была адкрыта класічная гімназія, якую пераўтварылі ў рэальную гімназію – першую рускую сярэднюю навучальную ўстанову. У 1872 г. рэальная гімназія была пераўтворана ў рэальнае вучылішча. З 1830 па 1884 г. тут навучалася 10 166 чалавек, 42 навучэнцы закончылі курс на камерцыйным аддзяленні. На ўтрыманне вучылішча штогод выдаткоўвалася 34 970 руб. 40 кап. з дзяржаўнага казначэйства і 3 536 руб. паступіла з спецыяльных сродкаў вучылішча [1, с. 368].

На 1 студзеня 1865 г. па афіцыйных дадзеных па Віцебскай і Магілёўскай губернях налічвалася 224 народных вучылішча, а на 1 студзеня 1866 г. толькі ў Віцебскай губерні было ўжо 183 вучылішчы. Больш-менш добра ішлі справы ў вучылішчах, якія ўтрымліваліся на грошы вясковых таварыстваў. На 1 студзеня 1868 г. штатных вучылішчаў у Віцебскай губерні, г. зн. вучылішчаў дастаткова забяспечаных матэрыяльна і якія мелі пэўны штат служачых, налічвалася 102.

У гэты час у Латгаліі, як і наогул ва ўсіх беларускіх губернях, большая частка сялянскіх сем’яў не мела магчымасці даць якую-небудзь сістэматычную адукацыю сваім дзецям. Асноўнымі настаўнікамі дзяцей з’яўляліся іх маці, якія самі ледзь маглі чытаць і пісаць. У асобных выпадках сялянскіх хлопчыкаў, якія прыслужвалі ў касцёле, грамаце навучалі ксяндзы. Да сярэдзіны 1860-х гг. царскі ўрад мала ўдзяляў увагі развіццю школьнай справы ў Латгаліі. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. у Заходнім краі пачалі адкрывацца першыя вучылішчы Міністэрства народнай асветы, навучанне ў якіх вялося на рускай мове, што было вынікам русіфікатарскай палітыкі ўрада. Настаўнікі зусім не ведалі ці дрэнна валодалі латышскай мовай, што ў значнай ступені не

спрыяла павышэнню граматнасці і культурнага ўзроўню сялянства. Латышскіясяляне з недаверам адносіліся да ўрадавых школ і адмаўляліся пасылаць туды сваіх дзяцей. Гэтаму таксама ў значнай ступені спрыяла і тайная прапаганда ксяндзоў, якія імкнуліся процідзейнічаць навучанню латышскіх дзяцей у рускіх школах [1, с. 373].

Курс навучання быў празмерна кароткі. Урадавыя чыноўнікі строга прытрымліваліся таго, каб у вучылішчах не было ніякіх адступленняў ад вызначанай праграмы. Аднак, валасныя праўленні, у абавязкі якіх уваходзіла ўтрыманне вучылішчаў, не ўдзялялі гэтаму належнай увагі. Так, у адным з цыркуляраў Віцебскай дырэкцыі народных вучылішчаў за 1865 г. адзначалася, што ў некаторых навучальных установах вывучаюцца прадметы, якія не прадугледжаны: геаграфія, гісторыя, светапогляд, сельская гаспадарка, "что не может быть допустимо" [4, л. 119].

У памяшканнях было брудна, цёмна і холадна. Не хапала падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Для сялянскіх сем'яў, асабліва немаёмасных, навучанне дзяцей у школе было непасільнай ношай: падлеткі не маглі ўжо ў поўнай меры дапамагаць дарослым па гаспадарцы, да таго ж былі патрэбны пэўныя выдаткі на адзенне, абутак, харчаванне і г.д.

На запыт царскай адміністрацыі ў пачатку XX ст. аб неабходнасці ўвядзення ўсеагульнага абавязковага навучання большасць валасных старшынь адказала адмоўна, спасылаючыся на беднасць насельніцтва. Вось што, напрыклад, адказаў адзін са старшынь: "Желательно обучаться всем, но не хватает средств, разве богатые выдержат, бедные – только при помощи казны» [5, с. 49].

Нават урадавыя чыноўнікі вымушаны былі прызнаць, што прычынай нізкай граматнасці насельніцтва Віцебскай губерні, у тым ліку і насельніцтва Латгаліі, было цяжкае эканамічнае становішча сялянства. Аб гэтым сведчыць і справаздача дырэкцыі народных вучы-лішчаў за 1894 г., у якой адзначалася: "К неблагоприятным условиям жизни и деятельности народной школы в нашей губернии относится крайняя бедность населения" [4, л. 65]. Паколькі бацькі без ахвоты адпускалі дзяцей на заняткі ў час палявых работ, навучэнцы наведвалі школу нерэгулярна.

Адзін з настаўнікаў Балваўскага вучылішча паведамляў у 1892 г.: «учение в народных училищах должно начаться 1 сентября… но, несмотря на это, учеников в училище не было до 12 сентября; с 12 октября по 17 ноября ученики собрались. В декабре ученики стали самовольно оставлять школу. В конце декабря из 54 человек осталось 47, в январе – 40, в феврале – 38, в марте – 33, а в апреле только 5» [4, л. 6].

Віцебская дырэкцыя народных вучылішчаў зрабіла запыт па гэтым пытанні, на што балваўскі валасны старшыня адказаў, што, нягледзячы на неаднаразовыя патрабаванні валаснога кіравання, сяляне з-за цяжкага матэрыяльнага становішча не маюць магчымасці накіроўваць сваіх дзяцей у школу к пачатку вучэбнага года.

Народныя вучылішчы, якія давалі сялянскім дзецям самыя элементарныя веды, не маглі адыгрываць істотнай ролі ў справе павышэння граматнасці і культурнага ўзроўню сельскага насельніцтва. Як правіла, падлетак праз 3–4 гады пасля заканчэння вучылішча ледзь мог распісацца. У пачатку XX ст. у “Трудах местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности” адзначалася: «Нынешняя школа никакого следа на крестьянина не оставляет и, несмотря на её сорокалетнее существование, видимой пользы нет, и грамотный крестьянин – почти редкость» [6, с. 34]. Тым не менш і такіх вучылішч у Латгаліі было мала: па дадзеных Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта за 1903 г. адна сельская школа ў губерні прыходзілася на 33 кв. вярсты, ці на 1 188 жыхароў [4].

Калі параўнаць Латгалію з астатнімі часткамі Латвіі, то яна ў справе граматнасці насельніцтва значна адставала. У 1911 г. тут наведвала школу толькі 22,9% сялянскіх дзяцей школьнага ўзросту, у той час як у Курзэме – 40,7%, а ў Відзэме – 43,0% [7, с. 20]. Што тычыцца параўнання ўзроўню граматнасці насельніцтва Латгаліі з астатняй часткай тэрыторыі Віцебскай губерні, то ў апошняй ён быў значна ніжэйшы.

У пачатку XX ст. у Латгаліі асабліва на нізкім ўзроўні знаходзілася жаночая адукацыя. Сяляне бачылі большую практычную выгаду ад навучання хлопчыкаў: адукаваны з іх мог хутчэй атрымаць добрую работу ў адыходніцтве, лягчэй прыстасавацца да ваеннай службы, а таксама актыўней удзельнічаць у справах сялянскага самакіравання.

Значны ўплыў на распаўсюджванне граматнасці ў вёсцы аказваў маёмасны фактар. Выключэнне складалі беззямельныя сяляне, сярод якіх працэнт навучэнцаў быў вышэйшы, чым сярод малазямельных сялян: вымушаныя жыць выключна за кошт продажу сваёй працы, беззямельныя сяляне цанілі граматнасць, дзякуючы якой можна было лягчэй знайсці работу.

У заключэнні можна зрабіць выснову, што вынікі навучання ва ўсіх навучальных установах Віцебскай губерні ў адзначаны перыяд былі не зусім дрэннымі. Асабліва гэта тычыцца дзейнасці сельскіх народных вучылішчаў. Аднак, агульны ўзровень адукацыі ў дарэвалюцыйныя гады, як у Латгаліі, так і ў Беларусі, а таксама ў Расіі заставаўся

на даволі нізкім узроўні і павышаўся вельмі павольна. Адмоўную ролю ў гэтым адыграла не столькі палітыка ўраду, як прынята было лічыць ў савецкай гістарыяграфіі, колькі агульнае сацыяльна-эканамічнае становішча краіны. А яно было такім, што для большасці насельніцтва, асабліва сельскага, адукацыя была мала патрэбнай у штодзённым жыцці.

**Выкарыстаныя крыніцы:**


1. Витебская губерния : Ист.-геогр. и стат. обзор : Сост. по прогр. и под ред. кн. В. М. Долгорукова. Вып. 1. – Витебск : Губ. тип., 1890. – 387 с.

2. Случевский, К.К. По северо-западу России. Т. 2. По западу России / К.К. Случевский. – Спб. : Изд-во А. Ф. Маркса, 1897. – 479 с.

3. Виленский сборник: № 1. – Вильна : Изд. В. Кулин, 1869. – /2/, XXIII.

4. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі. Ф. 657. Воп. 1. Спр. 14.

5. Шкільтэр, К. Латышскі селянін на Беларусі да і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі / К. Шкільтэр. – Мінск : Выд. АН БССР, 1935. – 144 с.

6. Турук, Ф.Ф. Белорусское движение : Очерки истории нац. и рев. движения белорусов : С прил. образцов белорус. нелег. литературы, важнейших документов белорус. полит. и нац. организаций и этногр. карты белорус. Племени сост. акад. Е. Ф. Карским / Ф. Турук. – Москва : Гос. изд-во, 1921.– 144 с.

7. Егизарян, А.М. Об основных тенденциях развития социалистических наций в СССР / А.М. Егизарян. – Ереван : Айастан, 1965. – 115 с.